**19.** Якія з дадзеных гукаў не маюць парных глухіх?

*1) [л]; 2) [р]; 3) [в]; 4) [в’]*

**А)** усе прыклады. **Б)** усе прыклады, акрамя 1.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 2, 3. **Д)** 3, 4.

**20.** Фанетыка – раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца … .

*1) склад слова; 2) будова слова; 3) націск;*
*4) інтанацыя; 5) гукі.*

Выберыце патрэбныя варыянты.

**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 2.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4.

**21.** Выберыце з прапанаваных толькі назоўнікі мужчынскага роду:

*1) палын; 2) лебедзь; 3) шынель; 4) пола; 5) фае.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**22.** Вызначце словы з падоўжанымі зычнымі:

*1) двухгалоссе; 2) магазінны; 3) заціша; 4) каменны.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** усе варыянты, акрамя 4. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

**23.** Хто з культурных дзеячаў старажытнай Беларусі атрымаў у народзе імя ***Златавуст***?

**А)** Францыск Скарына. **Б)** Кірыла Тураўскі. **В)** Сымон Будны.
**Г)** Мікола Гусоўскі. **Д)** Мялецій Сматрыцкі.

**24.** Для беларускай мовы ўласціва фанетычная з’ява *дзеканне і цеканне*. Для якой мовы яшчэ характэрна такая з’ява?

*1) для рускай мовы; 2) для ўкраінскай мовы; 3) для польскай мовы.*

**А)** усе варыянты правільныя.
**Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 28700 экз. г. Мінск. 2014 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2014»

*Чацвер, 20 лютага 2014 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Які назоўнік з’яўляецца адгадкай выдзеленага ў народнай загадцы слова?

*Каля **ямы** ўсе з кіямі.*

**А)** каструля. **Б)** міска. **В)** гаршчок. **Г)** збан. **Д)** кубак.

**2.** Якога слова не хапае ў вершаваных радках Галіны Каржанеўскай?

*Гэтак спрытна беляць столь!*
*Я сваім вачам не веру:*
*Стала белаю, як соль,*
*Як мука і як папера.*
*Буду ведаць:*
*… – незвычайныя майстры.*

**А)** муляры. **Б)** маляры. **В)** цесляры. **Г)** сталяры. **Д)** ганчары.

**3.** Што, як толькі з’явілася і пачалі на ім працаваць, у народзе называюць *«сталёвы конь»*?

**А)** камбайн. **Б)** трактар. **В)** плуг. **Г)** цэп. **Д)** грузавік.

**4.** У якіх словах з дадзеных правільна пастаўлены націск?

*1) муля□рскі; 2) сівы□; 3) куха□рскі.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**5.** Колькі слоў ужыта ў сказе?

*Няхайкрасалюбімайзямліўзадушэўнайпесніадгукнецца.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**6.** Пра якую птушку ў народзе склалі загадку?

*Шапачка маленькая, камізэлька нятканая, кафтанік рабенькі, ходзіць босенькі.*

**А)** пра гусь. **Б)** пра зязюлю. **В)** пра жураўля.
**Г)** пра вераб'я. **Д)** пра шпака.

**7.** Падбярыце з прапанаваных слоў сінонім(-ы) да назоўніка ***балота***:

*1) дрыгва; 2) багна; 3) дрыгвянік; 4) багнішча.*

**А)** усе словы. **Б)** 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 4.

**8.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ш***?

*1) па ..часціць; 2) пя..чаны; 3) раска..чык; 4) мые..ся.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 1, 4. **Д)** 2, 3, 4.

**9.** Адной з найбольш ужывальных часцін мовы (пасля назоўніка) мовазнаўцы лічаць … .

**А)** прыметнік. **Б)** дзеяслоў. **В)** прыслоўе.
**Г)** лічэбнік. **Д)** займеннік.

**10.** Выберыце з прапанаваных слова, у якім на месцы пропуску напішаце літару ***а***:

*1) шч..гол; 2) сельд..рэй; 3) пл..вец.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**11.** Літару ***ь*** патрэбна напісаць на месцы пропуску у словах:

*1) бац..вінне; 2) ц..вік; 3) ц..вет; 4) ц..вердзь.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Дадзены назвы птушак:

*1) кнігаўка; 2) салавей; 3) сініца; 4) груган; 5) глушэц.*

Падбярыце дзеясловы, якія абазначаюць іх спевы:

*а) шчоўкаць; б) кігікаць; в) такаваць; г) каркаць; д) цінькаць; е) крумкаць; ё) кракаць; ж) буркаваць.*

**А)** 1-ж; 2-г; 3-а; 4-в; 5-б. **Б)** 1-ё; 2-в; 3-б; 4-д; 5-а.
**В)** 1-а; 2-б; 3-е; 4-д; 5-ж. **Г)** 1-д; 2-е; 3-г; 4-б; 5-ё.
**Д)** 1-б; 2-а; 3-д; 4-е; 5-в.

**13.** Якое слова прапушчана ў народнай прыкмеце?

*Багата снегу – багата … .*

**А)** вады. **Б)** работы. **В)** яды. **Г)** хлеба. **Д)** турбот.

**14.** Падбярыце з дадзеных слоў антонімы да дзеяслова ***есці***:

*1) сталавацца; 2) карміцца; 3) падсілкоўвацца.*

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**15.** Вучні запісвалі назоўнікі ў форме меснага склону адзіночнага ліку. Алесь запісаў: *на крызе, аб дачцы*. Паліна – *у лазне, аб кветцы*. Юрась – *на вежы, аб сястрэ.*

Хто з вучняў правільна зрабіў запіс?

**А)** усе вучні. **Б)** усе вучні дапусцілі памылкі.
**В)** Алесь. **Г)** Паліна. **Д)** Юрась.

**16.** Дапоўніце народныя выслоўі па дадзенаму пачатку:

*1) цішэй едзеш – …; 2) рыба шукае, дзе глыбей, а чалавек – …;*
*3) далей у лес – …; 4) чым ноч цямней, тым … .*

Выберыце патрэбны варыянт:

*а) дзе лепей; б) болей дроў; в) ясней зоры; г) далей будзеш.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-а, 3-б, 4-в. **Д)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.

**17.** Як называецца рака, на якой быў пабудаваны старажытны горад Тураў?

**А)** Свіслач. **Б)** Днепр. **В)** Прыпяць. **Г)** Шчара. **Д)** Дзвіна.

**18.** Умоўная назва часу, які трэба ведаць для падарожжа ў мінулае, – … .

**А)** археалагічны. **Б)** геалагічны. **В)** гістарычны.
**Г)** архаічны. **Д)** тапаграфічны.